**Т. С. ЮХНАВЕЦ**

# ЗМЯНЕННІ Ў ФАРМІРАВАННІ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ БІБЛІЯТЭК ЯК ВЫНІК РАЗВІЦЦЯ СУЧАСНАЙ СІСТЭМЫ АДУКАЦЫІ

*Прадстаўлены тэндэнцыі развіцця сучаснай сістэмы адукацыі і выкліканыя імі змястоўна-арганізацыйныя змяненні ў фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк. Акцэнтуецца ўвага на асаблівасцях фарміравання інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк вышэйшых навучальных устаноў і павелічэнні колькасці студэнтаў сярод карыстальнікаў не толькі дадзеных бібліятэк, але і бібліятэк іншых відаў. Даюцца рэкамендацыі па фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк з мэтай эфектыўнага задавальнення адукацыйных інфармацыйных патрэб карыстальнікаў.*

Узмацненне ролі інфармацыі і ведаў у грамадскім развіцці, паступовае ператварэнне ведаў у асноўны капітал прынцыпова мяняюць роль сферы адукацыі ў структуры грамадскага жыцця сучаснага свету. Адукацыйная сістэма аказваецца цесна пераплеценай з усімі элементамі гэтай структуры, і ад яе стану, здольнасці задавальняць патрэбы асобы і грамадства ў высокаякасных адукацыйных паслугах шмат у чым залежыць ход грамадскага развіцця. У той жа час пашырэнне сферы адукацыі і змяненне яе статусу суправаджаецца абвастрэннямі праблем у гэтай сферы, што сведчыць аб крызісе адукацыі. У працэсе пошуку шляхоў пераадолення гэтага крызісу ў апошнія дзесяцігоддзі адбываецца фарміраванне новай адукацыйнай сістэмы. Паколькі сістэма адукацыі, роўна як і іншая сацыяльная структура, узаемадзейнічае з грамадскімі падсістэмамі, тым самым аказвае на іх пэўны ўплыў і адчувае на сабе ўздзеянне з боку апошніх, у бібліятэчна-інфармацыйнай сферы таксама ідзе распрацоўка і ўкараненне інавацыйных мадэляў дзейнасці з улікам сучасных кірункаў і тэндэнцый развіцця сістэмы адукацыі. У першую чаргу гэта тычыцца фарміравання інфармацыйных рэсурсаў. Праблема фарміравання інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк ва ўмовах рэфармавання адукацыі на працягу апошняга дзесяцігоддзя ўздымалася ў працах расійскіх вучоных і спецыялістаў В. Д. Апарынай [12], І. Ю. Багровай [1], Н. В. Жадзько [5], І. П. Осіпавай [13], І. С. Пілко [14] і інш.; абмяркоўвалася на міжнародных навукова-практычных канферэнцыях і семінарах. Менш актыўна дадзеная праблема разглядаецца ў беларускім прафесійным асяроддзі, што, у сваю чаргу, прыводзіць да адсутнасці канкрэтных і дакладных механізмаў фарміравання інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк у адзначаных умовах.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Мэта* дадзенага *артыкула* – паказаць змястоўна-арганізацыйныя змяненні, якія адбываюцца ў фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк пад уплывам тэндэнцый развіцця сучаснай адукацыйнай сістэмы. Атрыманыя вынікі садзейнічаюць выпрацоўцы эфектыўных шляхоў фарміравання інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк.

На мадэрнізацыю сістэмы адукацыі арыентавана мноства нацыянальных і міжнародных нарматыўных прававых дакументаў, праграм, праектаў, стандартаў і інш. Тут, у першую чаргу, варта адзначыць Балонскую дэкларацыю «Еўрапейская прастора вышэйшай адукацыі» (1999) і «Нацыянальную стратэгію ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 г.» (2004) [3; 10]. Апошні дакумент ставіць мэтай «стварэнне сістэмы адукацыі, якая адпавядае патрэбам асобы, грамадства і дзяржавы, фарміраванне ўмоў для яе далейшага развіцця, падрыхтоўкі новых пакаленняў да жыцця і працы ў грамадстве з устойлівай сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікай» [10, с. 75].

Той факт, што аб’ём ведаў расце, у той час як хуткасць, з якой гэтыя веды паглынаюцца і ўзбагачаюцца адным чалавекам, застаецца пастаяннай, вядзе да далейшай спецыялізацыі і драбленню адукацыі. З іншага боку, адбываецца змена парадыгмы «Адукацыя = Навучанне» парадыгмай «Адукацыя = Станаўленне», дзе маецца на ўвазе станаўленне чалавека, яго самафарміраванне і самаафармленне ў асобу. Калі раней паняцце «адукацыя» атаясамлівалася з арганізаваным і працяглым працэсам навучання ў пачатковай, сярэдняй і вышэйшай школе, то сёння такая адукацыя стала называцца фармальнай, атрымала развіццё ідэя аб тым, што паняцце «адукацыя» значна шырэй, чым паняцце «фармальная адукацыя». У гэтай пашыранай трактоўцы пад «адукацыяй» разумеецца дзейнасць, якая мае мэтай змяніць устаноўкі і мадэлі паводзін асобы шляхам перадачы ёй новых ведаў, развіцця новых уменняў і навыкаў. У «Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі» (2011) адукацыя вызначаецца як «навучанне і выхаванне ў інтарэсах асобы, грамадства і дзяржавы, накіраваныя на засваенне ведаў, уменняў, навыкаў, фарміраванне гарманічнай, рознабакова развітой асобы» [11].

Такім чынам, галоўная тэндэнцыя развіцця сучаснай сістэмы адукацыі заключаецца ў рашэнні праблемы асобасна арыентаванай адукацыі, гэта значыць такой адукацыі, у якой асоба вучня, студэнта знаходзіцца ў цэнтры ўвагі педагога і псіхолага і дазваляе ўлічваць магчымасці кожнай канкрэтнай асобы і садзейнічаць яе самарэалізацыі і развіццю. Важным фактарам пры гэтым з’яўляецца фарміраванне ў навучэнцаў уменняў вучыцца, уменняў самастойнай кагнітыўнай дзейнасці з выкарыстаннем сучасных і перспектыўных сродкаў інфармацыйных тэхналогій, уменняў праектаваць магчымыя шляхі развіцця сваёй прафесійнай будучыні.

Сучасная сістэма адукацыі арыентавана на рэалізацыю высокага патэнцыялу камп’ютарных і тэлекамунікацыйных тэхналогій. Перад ёй стаяць задачы распрацоўкі метадалогіі, метадаў і спосабаў злучэння інфармацыйных, дэманстрацыйных і інтэрактыўных магчымасцей камп’ютарных тэх-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

налогій, у тым ліку сеткі Інтэрнэт. Адсюль набывае тэндэнцыйны характар навучанне на адлегласці або дыстанцыйнае навучанне.

Яшчэ адна тэндэнцыя развіцця сучаснай адукацыйнай сістэмы заключаецца ў арыентацыі на адукацыю, якая стварае веды. Як адзначае Й. Масуда: «Калі ў індустрыяльным грамадстве адукацыя арыентавана на напаўненне галоў студэнтаў інфармацыяй і навучанне іх пэўным методыкам, то ў інфармацыйным грамадстве адукацыя такога тыпу будзе выцеснена адукацыяй, якая стварае веды, паколькі інфармацыйнае грамадства будзе развівацца праз зацвярджэнне каштоўнасці інфармацыі ў грамадстве, заснаваным на ведах» [15, p. 112]. Гэта, відавочна, дазволіць радыкальна вырашыць праблемы якасці і рэлевантнасці адукацыі.

Таксама найбольш выразна праяўляюцца наступныя тэндэнцыі: распрацоўка і ўкараненне ў адукацыйны працэс сістэм забеспячэння і кіравання якасцю адукацыі; выкарыстанне ўстановамі адукацыі дадатковых крыніц фінансавання (даходы ад уласнай камерцыйнай дзейнасці, сродкі спонсараў і інш.).

Аналіз тэндэнцый развіцця сучаснай адукацыі дазволіў выявіць два глабальныя працэсы, якія, з аднаго боку, супрацьстаяць адзін аднаму, а з другога – узаемазвязаны і дапаўняюць адзін аднаго. Гэта працэсы *дыверсіфікацыі* і *інтэрнацыяналізацыі* адукацыі. Дыверсіфікацыя звязана з арганізацыяй новых адукацыйных устаноў, з наданнем адукацыйных функцый грамадскім установам, з увядзеннем новых кірункаў навучання, новых дысцыплін і інш. Інтэрнацыяналізацыя адукацыі, наадварот, накіравана на «збліжэнне нацыянальных сістэм, знаходжанне і развіццё ў іх агульных універсальных канцэптаў і кампанентаў, тых агульных падстаў, якія складаюць аснову разнастайнасці нацыянальных культур, садзейнічаючы іх узаемаўзбагачэнню» [8, с. 29–30].

Бібліятэкі як галоўныя сацыяльныя інстытуты, якія забяспечваюць збор, захаванне і выкарыстанне грамадска-карыснай інфармацыі, фарміруюць інфармацыйныя рэсурсы, якія ў цэлым уяўляюць сабой канцэнтраваны масіў дакументаванай інфармацыі, які паведамляе веды з усіх сфер дзейнасці грамадства. Удзел бібліятэк у працэсах адукацыі арыентаваны на рашэнне трох асноўных задач:

– прадстаўленне інфармацыйных рэсурсаў для адукацыі па-за праграмамі школ і вышэйшых навучальных устаноў у мэтах самаадукацыі і ўдасканалення;

– дапаўненне інфармацыйных рэсурсаў навучальнай установы, прадстаўленне крыніц і магчымасцей для вучобы школьнікам і студэнтам вышэйшых навучальных устаноў;

– садзейнічанне працэсу накаплення ведаў, уменняў і здольнасці пранікаць у сутнасць з’яў праз чытанне, прагляд фільмаў, удзел у дыскусіях [1; 13].

Пры фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў бібліятэкі важна ўлічваць той факт, што фармальныя веды саступаюць месца больш збалансаванай сістэме ведаў, якая ўключае фармальныя веды, прыкладныя веды і метаведы, і што перадача ведаў можа ажыццяўляцца мноствам спосабаў з выкарыстаннем тэлекамунікацыйных тэхналогій [9]. Пры гэтым бібліятэка не ператвараецца ў архіў або склад разрозненай інфармацыі. Здзяйсняючы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сістэматызацыю, захоўванне і распаўсюджванне інфармацыйных рэсурсаў, яна забяспечвае абарачэнне ведаў. І калі адукацыю разглядаюць як працэс і вынік засваення сістэматызаваных ведаў, то бібліятэка ўвасабляе сабой галоўны сацыяльна-культурны інстытут, які аказвае значны ўплыў на працэс інтэлектуалізацыі грамадства.

Асаблівае месца ў сістэме адукацыі належыць бібліятэкам вышэйшых навучальных устаноў, таму што падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі немагчыма без паўнацэннага забеспячэння адукацыйнага працэсу вучэбнымі і навуковымі дакументамі. Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэкі вышэйшай навучальнай установы маюць спецыфічныя ўласцівасці, да ліку якіх адносяцца:

– значнасць у павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў;

– дакладнае мэтавае прызначэнне (садзейнічанне вучэбна-выхаваўчаму працэсу, вучэбна-даследчай і навукова-даследчай дзейнасці);

– арыентацыя на пэўныя групы карыстальнікаў;

– наяўнасць патрабаванняў да складу і структуры інфармацыйных рэсурсаў;

– кантроль якасці інфармацыйных рэсурсаў;

– пастаяннае абнаўленне інфармацыйных рэсурсаў у адпаведнасці са зменамі вучэбных планаў і праграм.

На сучасным этапе студэнты вышэйшых навучальных устаноў складаюць найбольшы працэнт ад агульнай колькасці карыстальнікаў любой бібліятэкі і менавіта навуковыя і вучэбныя інфармацыйныя рэсурсы карыстаюцца самым вялікім попытам. Катэгорыю студэнтаў адрознівае тэматычная, практычна энцыклапедычная шырыня інфармацыйных запытаў. Акрамя таго, запыты штогод тэматычна абнаўляюцца па меры праходжання студэнтамі курсаў навучання. Насуперак меркаванню, якое ўжо ўстаялася, дакументы вучэбнага характару не з'яўляюцца пераважнымі ў запытах студэнтаў і дыяпазон неабходных ім відаў дакументаў самы разнастайны. Так, напрыклад, вынікі анкетавання карыстальнікаў-студэнтаў Дзяржаўнай публічнай навукова-тэхнічнай бібліятэкі Сібірскага аддзялення Расійскай акадэміі навук паказалі, што пры напісанні дыпломных работ студэнты аддаюць перавагу манаграфіям. На трэцім месцы па папулярнасці ў гэтай катэгорыі карыстальнікаў аказаліся дысертацыі і аўтарэфераты дысертацый. 20% з ліку апытаных студэнтаў адзначылі свой удзел у навукова-даследчай рабоце, гэта значыць мэтай іх наведвання бібліятэкі з'яўляецца пошук інфармацыі для напісання навуковай справаздачы. Пры гэтым 74% апытаных выкарыстоўваюць у рабоце не толькі вучэбныя дапаможнікі, але і навуковыя выданні [6]. Дадзеныя факты сведчаць аб змяненні падыходу да навучання ў вышэйшых навучальных установах. Да гэтага варта дадаць і той факт, што навукова-даследчая работа студэнтаў прызнана адным з важнейшых сродкаў павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, здольных творча прымяняць у практычнай дзейнасці дасягненні навукова-тэхнічнага прагрэсу, а, значыць, хутка адаптавацца да сучасных умоў развіцця эканомікі. Тым не менш вынікі даследаванняў выявілі істотную супярэчнасць у адукацыйнай практыцы бібліятэк. Яна заключаецца ў тым, што «любы запыт вучнёўскай аўдыторыі пачынае разглядацца пераважна як вучэбны, што ў практыцы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

любых бібліятэк (і акадэмічных, і публічных) прыводзіць да дамінантнага камплектавання падручнікамі, вучэбнымі дапаможнікамі» [5]. Таму можна дапусціць, што арыентаванне бібліятэкі на вучэбныя дакументы прывядзе да скарачэння кантынгентных груп, да ўтварэння лакун у фондах навуковых, вытворчых і іншых дакументаў, а імкненне да іх ліквідацыі абумовіць неабходнасць павелічэння фінансавых сродкаў на камплектаванне фондаў. Больш таго, статус навуковай бібліятэкі вышэйшай навучальнай установы можа змяніцца на статус вучэбнай бібліятэкі.

Па меркаванні спецыялістаў, нягледзячы на ўдзел студэнтаў у навуковых даследаваннях або самастойнае выкананне імі навуковых прац, камплектаванне фонду вучэбнымі дакументамі ў бібліятэцы вышэйшай навучальнай установы павінна захаваць прыярытэтныя пазіцыі. Аднак варта мець на ўвазе, што навуковая і дадатковая літаратура выступаюць асновай для навуковага і метадычнага забеспячэння працэсаў даследавання і навучання ў вышэйшай навучальнай установе. Таму для гэтай бібліятэкі актуальнай задачай становіцца выпрацоўка аптымальных крытэрыяў камплектавання і захавання вучэбных і навуковых дакументаў у яе фондзе.

Адзначаная задача падпарадкавана больш агульнай задачы распрацоўкі механізму эфектыўнага фарміравання фонду. Для рэалізацыі апошняй, у першую чаргу, неабходна вызначыць крытэрыі эфектыўнасці фарміравання фонду. На наш погляд, такімі крытэрыямі могуць выступаць:

– узровень забяспечанасці вучэбнага працэсу асноўнымі дакументамі, прыведзенымі ў вучэбных праграмах;

– узровень забяспечанасці практычных, лабараторных і семінарскіх заняткаў; курсавога і дыпломнага праектавання адпаведнымі метадычнымі дакументамі;

– якасны ўзровень вучэбных дакументаў, які вызначаецца па наяўнасці на іх грыфаў;

– узровень забеспячэння вучэбна-выхаваўчага працэсу і навуковых даследаванняў адпаведнымі дакументамі.

Аднак, валодаючы сучаснымі стратэгіямі эфектыўнага фарміравання фондаў і інфармацыйных рэсурсаў у цэлым, ні адна бібліятэка вышэйшай навучальнай установы не зможа самастойна дабіцца высокіх выніковых паказчыкаў іх рэалізацыі. Такое становішча абумоўліваецца ўплывам на бібліятэку шэрагу фактараў: змяненне і разнастайнасць інфармацыйных патрэб і запытаў карыстальнікаў у выніку шматузроўневай сістэмы навучання; патрэба ў фарміраванні электронных інфармацыйных рэсурсаў непасрэдна ў бібліятэцы для забеспячэння задач дыстанцыйнай адукацыі; павелічэнне рэпертуару вучэбных дакументаў і інш. Усё гэта прыводзіць да таго, што студэнты складаюць адну з асноўных катэгорый кантынгенту карыстальнікаў не толькі бібліятэкі вышэйшай навучальнай установы, але і любой іншай бібліятэкі і, адпаведна, яе роля ў адукацыі будзе ўзрастаць з цягам часу. Больш таго, па ацэнках спецыялістаў, тэндэнцыя росту студэнтаў у структуры карыстальнікаў бібліятэк захаваецца на бліжэйшыя гады [2; 4; 7]. Значыць, узнікае патрэба развіцця ўзаемадзеяння паміж бібліятэкамі ў галіне фарміравання адукацыйных інфармацыйных рэсурсаў. Бібліятэкі вышэйшых навучальных устаноў тут павінны заняць асобае



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

месца, паколькі яны накіроўваюць сваю дзейнасць на задавальненне выключна адукацыйных і навукова-даследчых інфармацыйных патрэб карыстальнікаў.

Такім чынам, раскрываючы змястоўна-арганізацыйныя змяненні, якія адбываюцца ў фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк пад уплывам тэндэнцый развіцця сучаснай сістэмы адукацыі, у першую чаргу, трэба адзначыць неабходнасць раздзялення задач публічных, спецыяльных і іншых бібліятэк па фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў. Па-другое, калі бібліятэкі розных відаў будуць дакладна разумець уласныя ўнікальныя магчымасці і задачы, то гэта дапаможа ім вызначыцца і з прыярытэтнай групай карыстальнікаў, і з прыярытэтамі ў фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў. Можна меркаваць, што бібліятэкі сутыкнуцца з праблемай інфармацыйнага забеспячэння як вузкай і глыбокай спецыялізацыі, так і шырокай падрыхтоўкі спецыялістаў, а таксама прадстаўлення выпускнікам магчымасці пастаяннага абнаўлення ведаў, уменняў і навыкаў праз інфармацыйныя рэсурсы. Таксама арыентацыя студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў на навукова-даследчую або выкладчыцкую працу не павінна дазволіць выключыць навуковую складальную пры фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў бібліятэкі, у тым ліку інфармацыйных рэсурсаў бібліятэкі вышэйшай навучальнай установы.


1. *Багрова, И. Ю.* Библиотека и образование : обзор зарубежной литературы за 1990–1998 гг. / И. Ю. Багрова // Библиотековедение. – 1999. – № 7-12. – С. 152–163.

2. Библиотека и чтение в структуре современного образования : материалы межрегион. науч. конф., Москва, 29 окт. 2009 г. / Рос. акад. образования, Науч. пед. б-ка им. К. Д. Ушинского ; редкол.: Ю. П. Мелентьева (отв. ред.) [и др.]. – М. : Наука, 2009. – 206 с.

3. ***Болонский процесс и его значение для России. Интеграция высшего образования в Европе / В. А. Белов [и др.] ; под ред. К. Пурсиайнена и С. А. Медведева. – М. : РЕЦЭП, 2005. – 199 с.***

4. *Есина, Т. А.* Социальный портрет молодого читателя областной универсальной научной библиотеки / Т. А. Есина // Библиотеки – молодежи : информ.-аналит. вестник / Рос. гос. юнош. б-ка ; гл. ред. И. Б. Михнова. – М., 2008. – Вып. 3. – С. 89–97.

5. *Жадько, Н. В.* Об особенностях учебного комплектования в практике публичных и вузовских библиотек / Н. В. Жадько // Библиотечное дело. – 2010. – № 19. – С. 10–12.

6. *Жарикова, Л. А.* Информационные запросы студентов Новосибирска : анализ и возможности поиска в систематическом и электронном каталогах ГПНТБ СО РАН / Л. А. Жарикова, Г. А. Скарук, А. В. Бобко // Библиотечно-информационные ресурсы в научно-образовательном комплексе территории : сб. науч. тр. / Гос. публ. науч.-техн. б-ка Сиб. отд-ния Рос. акад. наук ; отв. ред. Е. Б. Артемьева. – Новосибирск, 2001. – С. 63–75.

7. *Красикова, Е. Г.* Современный студент как пользователь библиотеки / Е. Г. Красикова // Науч. и техн. б-ки. – 2011. – № 3. – С. 115–124.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. *Купцов, О. В.* Непрерывное образование и его структура / О. В. Купцов // Высшее образование в Европе. – 1991. – Т. XVI, № 1. – С. 29–40.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. *Любаров, В. М.* Прогноз трендов развития общества для разработки стратегий в области познания, образования, накопления знаний и библиотечного дела / В. М. Любаров // Науч. и техн. б-ки. – 2005. – № 4. – С. 31–38.

10. Национальная стратегия устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь на период до 2020 г. / Нац. комиссия по устойчивому развитию Респ. Беларусь ; редкол.: Я. М. Александрович [и др.]. – Минск : Юнипак, 2004. – 202 с.

11. Об образовании : Кодекс Респ. Беларусь, 13 янв. 2011 г., № 243-З // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2011. – № 13. – 2/1795.

12. *Опарина, О. Д.* Оптимизация комплектования университетской библиотеки / О. Д. Опарина // Университетская библиотека: проблемы и решения : материалы V Всерос. науч.-практ. конф., Екатеринбург, 3–4 дек. 2002 г. / Урал. гос. ун-т. – Екатеринбург, 2003. – С. 43–47.

13. *Осипова, И. П.* Библиотека и образование: (К постановке проблемы) / И. П. Осипова // Библиотековедение. – 1999. – № 1. – С. 22–29.

14. *Пилко, И. С.* Образовательные услуги библиотек / И. С. Пилко // Библиотечно-информационные ресурсы в научно-образовательном комплексе территории : сб. науч. тр. / Гос. публ. науч.-техн. б-ка Сиб. отд-ния Рос. акад. наук ; отв. ред. Е. Б. Артемьева. – Новосибирск, 2001. – С. 38–44.

15. *Masuda, Y.* Managing in the information society : releasing synergy Japanese style / Y. Masuda. – Oxford ; Cambridge : Basil Blackwell, 1990. – 301 p.

*T. YUKHNOVETS*

**CHANGES IN FORMING OF LIBRARY INFORMATION RESOURCES AS A RESULT OF MODERN EDUCATION SYSTEM DEVELOPMENT**

*The new trends of the modern education system and the organizational changes caused by these trends in the process of forming of some new information library resources are presented in the article. The author pays his attention to the specific features of forming of information library resources in the higher education institutions and the increasing the number of students among the users of different kinds of library information recourses. Some recommendations on forming of library information resources are given.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ